**СКАЗ** – граматычна афармленая, сэнсава і інтанацыйна закончаная прэдыкатыўная цэласная адзінка, якая з’яўляецца галоўным сродкам фарміравання, выражэння і паведамлення думкі, волевыяўлення і эмоцый чалавека.

Прыметы сказа:

- **граматычная афармленасць** – словы і словазлучэнні ў сказе размяшчаюцца ў пэўнай паслядоўнасці і ўступаюць у адносіны і сувязі паміж сабой пры дапамозе прыназоўнікаў, інтанацыі і інш.;
- **прэдыкатыўнасць** – словы і словазлучэнні ў сказе суадносяць заключаны ў іх змест з рэчаіснасцю, паказваюць, што падзеі і факты, пра якія паведамляецца, існуюць, існавалі або будуць існаваць у момант маўлення як рэальныя ці пажаданыя;
- **мадальнасць** – у сказе выражаюцца адносіны выказвання да рэчаіснасці (аб’ектыўная мадальнасць), а таксама той, хто гаворыць, выражае свае адносіны да выказвання (суб’ектыўная мадальнасць), якая рэалізуецца пры дапамозе мадальных слоў, часціц, устаўных канструкцый і інш.;
- **сэнсавая завершанасць** – сказ заўсёды перадае адносна закончаны змест, што залежыць ад кантэксту, сітуацыі і аб’ёму інфармацыі, якую трэба перадаць;
- **інтанацыйная закончанасць** – інтанацыя з’яўляецца паказчыкам прэдыкатыўнасці, граматычнай афармленасці сказа, завершанасці яго сэнсу, а таксама мадальнасці.

У беларускім мовазнаўстве вывучэннем розных аспектаў простага сказа займаліся М.Г. Булахаў, Л.І. Бурак, Н.В. Гаўрош, А.Я. Міхневіч, Н.Ю. Паўлоўская, Н.У. Чайка і інш.

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ